Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
фота аўтара

# Сакрэт залатога голасу

**На гэтай вечарыне гаварылі пра творчасць і прафесійнае сумленне. Пра талент, душу і духоўнасць, крытэрыі ў мастацтве і ўнутраную культуру. Пра адказнасць кожнага чалавека за вынікі сваёй працы... А камертонам размовы быў яе галоўны герой — Ілья Курган, легендарны "голас мільёнаў", захавальнік і сапраўдны рыцар эталона моўнай культуры, прапагандыст беларускага мастацкага слова і ўзораў нашай літаратурнай класікі, дыктар і педагог, заслужаны артыст БССР, прафесар, які нядаўна сустрэў свае васемдзесят пяць.**



Яго юбілей адзначыла ўся культурная грамадскасць краіны. "ЛіМ", як вядома, прысвяціў такой адметнай даце першую паласу нумара, дзе штрыхі да творчага партрэта Ільі Кургана спалучыліся з аповедам пра новую кнігу, героем якой стаў ён сам. Наша публікацыя прыцягнула ўвагу Ганны Лель, куратара праекта "Кропка адліку" ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Патэлефанаваўшы ў рэдакцыю, падзялілася задумай наладзіць у межах свайго праекта мастацкую праграму, прысвечаную Майстру, там прадставіць і згаданую ў "ЛіМе" кнігу "Залаты голас Беларусі. Ілья Курган". Мы падказалі нумар тэлефона яе аўтара — Дэльфіны (псеўданім Алены Мінчуковай, пісьменніцы, драматурга, журналіста, пазаштатнага аўтара "ЛіМа").

Праз нейкі час атрымалі запрашэнне на імпрэзу, героем якой стаў легендарны Курган, нягледзячы на тое, што з-за спякотнага надвор'я ён мусіў у апошні момант адмяніць свой візіт у бібліятэку. На вечарыне рэй вялі яго вучні. Алена Мінчукова, выпускніца БДУКіМ па спецыяльнасці "рэжысёр дакументальнага кіно", падрыхтавала і невялічкі фільм. Мы бачылі на экране фотаздымкі розных гадоў, а за кадрам гучалі вершы — запіс пранікнёнага залатога голасу... Вядомы дзеяч тэатра Валерый Анісенка і актрыса Алена Унукава распавядалі пра свае стасункі з Майстрам, Настаўнікам, Псіхолагам. У іх развагах з курганаўскай бескампраміснасцю гучала трывога за культуру маўлення ў эфіры і на тэатральнай сцэне, за лёс айчыннай школы акцёрскага мастацтва, за духоўную перспектыву пакаленняў, узгадаваных на "ўзорах" масавай культуры. Адказ на пытанне пра сакрэт залатога голасу шукалі ўсе разам, згадваючы культ высокай літаратуры ў бацькоўскім доме І. Кургана, яго ўвагу да кожнага слова, да інтанацыі, да правільнасці націскаў і асэнсаванай паўзы, да ўвядзення ў падтэкст думкі, душы, духоўнасці...

Госці вечарыны адрасавалі гарачыя авацыі герою кнігі, які чуў "апладысменты па трансляцыі" — праз мабільны тэлефон. Шчыра дзякавалі А. Мінчуковай, намаганнямі якой жыццёвы, прафесійны, творчы, духоўны досвед Ільі Кургана, чалавека-эпохі, адлюстраваны ў захапляльнай кнізе і будзе перадавацца ўсім неабыякавым чытачам.

***На здымку: набыўшы кнігу "Залаты голас Беларусі. Ілья Курган", госці вечарыны падыходзілі па аўтограф да пісьменніцы Дэльфіны — Алены Мінчуковай (справа).***